ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
26
КАСТРЫЧНІКА
№ 28 (1621)

ЯКІМ БЫЦЬ РАЗМЕРКАВАННЮ?

Гэта пытанне хвалюе не толькі тых, хто сёлета закончыць універсітэт. Нераўнадушна адносяцца да яго і студэнты малодшых курсаў, выкладчыкі. Сведчанне таму — апошняе пасяджэнне рэктарата. З практыкай размеркавання выпускнікоў педагагічных патокаў азнаёміў прысутных начальнік аддзела кадраў А. М. Чэкан.

Т. ДОЎНАР.

ВЫДАТНАЕ ПАПАЎНЕННЕ

прыйшло ў спартыўныя зборныя універсітэта. Асабліва пашчасціла камандзе валейбалістак. Першакурсніца філалагічнага факультэта Алена Хаменка мае выдатную тэхнічную падрыхтоўку. Яна можа арганізаваць адладжаную гульню нападаючых ігракоў, а студэнткі І курса біялагічнага факультэта Каця Мінько і Алена Карнієвіч узмоцняць атакуючы патэнцыял каманды. Не бяда, што ў іх мала вопыту, затое ёсць жаданне павышаць узровень сваёй гульні.

Асабліва хочацца адзначыць студэнтку І курса факультэта прыкладной матэматыкі Таню Ламака. Сваёй энергіяй, працавітасцю, самаадданасцю яна паказвае прыклад і студэнтам старэйшых курсаў.

Пачалася спартакіяда ВНУ рэспублікі. Мужчынская і жаночая зборныя універсітэта па баскетболу ўжо паспяхова завяршылі першы тур спаборніцтваў. У лістападзе пачнуць гульні валейбалісты. Ёсць усе падставы спадзявацца, што з дапамогай навічкоў жаночая зборная па валейболу дасягне добрых вынікаў.

М. КУЧЫНСКІ,
старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

ЧАПЦАМІ ЗАКІДАЛІ

Мяне ўжо не здзіўляюць нашы аднадушна нядбайныя адносіны да ідэй, якія годдва назад лічыліся цудоўнымі, іначай як з воклічам «Ура!» і неабходным падкіданнем чапцоў угару не ўспрымаліся. Канкрэтна я — пра самакіраванне. Аптымісты і песімісты. Быць ці не быць? Нарэшце, сышліся: быць. Якім? Сённяшні студэнт ужо атрымаў многае з таго, чаго дамагалася не адно пакаленне. Лаўку сабе ў вучоным савеце «раздабылі»? Грамадскімі дэканатамі ўсцешыліся? Свае пяць капеек у работу стыпендыяльных камісій, гасразліковых аб'яднанняў, маладзёжных кааператываў, цэнтраў НТТМ уставіць маюць права? Здараюцца выпадкі замены лектара па просьбе групы, вольнага наведвання ўсіх без выключэння лекцый. Усё так. Аднак колькі грамадскіх дэканатаў было ліквідавана? А колькі фармальнасцей чыстай вады ва ўдзеле студэнтаў у вучоных саветах і розных камісіях?

Змены ў форме адбыліся. Але ці ў ёй справа? Прычыны даўнішнія і аб'ектыўныя — трывалая не ва ўсім эфектыўная сістэма выкладання і стэрэатыпы паводзін, якія студэнтам насаджаліся. Безагаворачная паслухмянасць — ні на кроплю болей і ні на крок далей. Студэнты — самае бяспраўнае звяно ў класічным трохвугольніку: адміністрацыя — студэнты — выкладчыкі. Спробы самастойных рашэнняў дакладна даследуюцца, каб... быць абвергнутымі. Нельга паспрабаваць пераздаць экзамен на бал вышэй, нельга выбраць аднаго з лектараў. А што, скажыце, можна? Падкінуць угару чапец і, набраўшы паветра, каб далёка было чутно, выгукнуць: «Ура!». Не самакіраванню — студэнцкаму форуму.

Цяпер вам зразумела, чаму звычайны чапец у нашых магазінах даўно ўжо дэфіцыт?

А. ЖУР,
студэнтка-завочніца.

ФОТА Ў НУМАР



Так зайсёды бывае ў жыцці: калі пачынаеш якую-небудзь нялёгкую справу, здаецца, няма ёй канца, а не паспеш азірнуцца, і ўсё ўжо знікла. Так здарылася і са Святланай Пацкаладчыкай дзейнасці. А што будзе нялёгкага ў адной з мінскіх школ, дзе студэнтам давялося праводзіць заняткі разам з настаўнікамі. Часам было зусім нялёгка ад вучнёўскіх «чаму». У «міру» ж Святлана з яўляецца членам студсавета інтэрната № 2, уваходзіць у арганізацыйны камітэт Дзён фізіка.

Наперадзе трохі менш за два гады вучобы. Можна не сумнявацца, што яны таксама прамільгнуць незаўважна.

А. МАЖАРА.
Фота аўтара.

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў КАМСАМОЛЕ

«Давайце азірнёмся назад»

МАНАЛОГ БЫЛОГА САКРАТАРА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГЕАФАКА ІГАРА ГРАМЫКІ З КАМЕНТАРЫЯМІ

Вось і закончыўся год маёй работы сакратаром камітэта камсамола геафака. Давайце спынімся, крыху пераводзём дыханне, азірнёмся назад. Напэўна, як і кожны чалавек, аналізуючы дасягнутае, я таксама ўсведамляю, што многае можна было зрабіць значна лепш. Ды і дапамога камсамольскага бюро магла быць больш важкай. Але, як кажуць, дадзім усім сястрыцам па завушніцы.

Камітэт наш часам нагадваў герояў байкі Крылова: цягнулі воз хто куды. Нашы бясконцыя спрэчкі з Юляй Карпук прывялі да рэзкага падзення дысцыпліны ў камітэце камсамола. А раўнадушша і безыніцыятыўнасць камсамольцаў Л. Святоха, Н. Конанавай, А. Пятрова і іншых ускладнілі сітуацыю. Такія адносіны, вядома, не дапамагалі агульнай справе.

КАМЕНТАРЫЙ ПЕРШЫ

— Як вы лічыце, ці ў стане камітэт камсамола нешта змяніць у вашым жыцці?

А. ВАЎРАНЦЮК (III курс): Нейкіх змен можна чакаць толькі тады, калі ў камітэт будуць выбраны людзі неабыякавыя, здольныя захапіць сваіх таварышаў цікавай справай, унесці ў камсамольскую дзейнасць нешта новае, свежае. Для гэтага неабходна больш актыўна далучаць да работы радавых членаў ВЛКСМ.

Я часта думаю над тым, чаму так здарылася? Чаму мы не змаглі з'яднаць камсамольцаў агульнай справай, а наадварот, кожны яшчэ больш стаў сам па сабе?

Напэўна, галоўная прычына ў тым, што ў камітэт трапілі выпадковыя людзі (пасапраўднаму зацікаўленых былі адзінкі). Прынцып «Хай будзе, хто хоча, толькі не я» пануе, на жаль, на справаздачна-выбарных канферэнцыях і зараз.

Сыграла сваю негатыўную ролю тое, што ўсе члены камітэта (за выключэннем Ю. Карпук) былі навічкамі ў камсамольскай рабоце. Спачатку доўга раскачваліся, а калі ўзяліся за справу, часу амаль не засталося.

Мяне непакоіць абыякавасць камуністаў Г. Рыдзеўскага і Я. Фадзеева. Прызнацца, я вельмі спадзяваўся на дапамогу таварышаў. Але потым пераканаўся, што ў іх няма ніякага жадання працаваць. Нават на пасяджэнні не з'яўляліся. А Рыдзеўскага бачылі толькі тады, калі яму неабходны былі грошы на ўзнагароды навукоўцаў (ён узначальваў факультэцкае СНТ) і граматы. Міжволі задумаешся, якая карысць ад такіх людзей камсамолу?

КАМЕНТАРЫЙ ДРУГІ

— Што такое, на ваш погляд, актыўная жыццёвая пазіцыя? Ці займаюць яе вашы таварышы?

Г. ДАБРАВОЛЬСКІ (III курс): Гэта ўменне адстойваць свае жыццёвыя прынцыпы, інтарэсы. Калі табе паверацъ, за табой пойдуць, гэта і будзе перамогай тваіх поглядаў, перакананняў. А ў цэлым — актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Што датычыць маіх таварышаў, то ўсіх актыўнымі не назаву. Не хачу і агулам абвінавачваць іх у пасіўнасці.

В. МАНЬКО (III курс): Сёння нельга сказаць, што калі чалавек з'яўляецца камсамольцам, то ён займае актыўную жыццёвую пазіцыю. У апошні час назіраецца даволі прагрэсіруючае зніжэнне актыўнасці. Мы становімся часам абыякавымі назіральнікамі таго, што адбываецца. Аб'яднаць, павысіць цікаўнасць маладых людзей маглі б, на маю думку, маладзёжныя арганізацыі, створаныя з улікам агульных інтарэсаў і схільнасцяў.

А Саюз камуністычнай моладзі... Я, напрыклад, у камунізм не веру.

Ды і пытанні вашай анкеты — не што іншае, як спроба паставіць чарговую «галачку» у графе «Правядзенне апытання камсамольцаў». Каму патрэбны гэты фармалізм?

Магчыма, усё было б інакш, каб мы з самага пачатку работы ў камітэце камсамола распрацавалі канкрэтную праграму дзеянняў і на працягу года прытрымліваліся яе. Толькі кожны з нас не вельмі імкнуўся праяўляць уласную ініцыятыву, бо ўжо прывыклі да ўказанняў зверху. Таму і кідаліся ў розныя бакі, хапаліся адразу за ўсё і амаль нічога не даводзілі да канца. Ды і рукі апускаліся, гледзячы на раўнадушша таварышаў. Хацелі правесці на факультэце апытанне. На жаль, нічога ў нас не атрымалася: большая частка студэнтаў засталася глухой да нашай ініцыятывы.

Асабліва крыўдна было, калі чулі крытыку ў свой адрас, пажаданні правесці тое ці іншае мерапрыемства, а браліся за справу — зноў ніякай падтрымкі. Не здымаю віны і з сябе: напэўна, не маглі мы знайсці ключ да сэрца кожнага, не сталі тым стрыжнем, вакол якога згуртаваліся б камсамольцы.

КАМЕНТАРЫЙ ТРЭЦІ

— Ці прытрымліваецеся вы пункту гледжання, што камсамол сёння наогул можна распусціць?

Н. ЧЭРНІК (I курс): У такой форме, як зараз, камсамол сапраўды не патрэбны — ён стаў фармальнай арганізацыяй. Неабходна шукаць нейкія новыя формы работы. І наогул лічу, што многае можна выправіць, калі прымаць у камсамол толькі тых юнакоў і дзяўчат, якія хочуць нешта рабіць і змогуць падняць прэстыж ВЛКСМ.

Б. А. МАНАК, дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін: Мне крыўдна і балюча чуць гэта. Майму пакаленню таксама было нялёгка. Але мы знаходзілі ў сабе сілы і пераадольвалі цяжкасці. Не магу пагадзіцца з думкай многіх, што сённяшняя моладзь абыякавая да ўсяго. Мне здаецца, яна проста разгубілася. Яе вывеў з раўнавагі вялікі паток інфармацыі. Але ўсё гэта — з'ява часовая. Моладзі патрэбна арганізавацца. Галоўная задача для яе сёння — выдатная вучоба. І, нарэшце, дзе ж ўласная гордасць кожнага камсамольца. Яшчэ тры такія пакаленні і мы не будзем развітой краінай, а вернемся да ўзроўню першабытнага ладу.

Магчыма, некаму мае меркаванні здадуцца надта песімістычнымі. Маўляў, былі ж цікавыя вечары, конкурсы. Так, былі. Некаторыя ўспомняць пасвячэнне ў студэнты (тут выдатна паказаў сябе былы трэці курс), конкурс мастацкай самадзейнасці першакурснікаў. А колькі вяселля прынеслі дні геафака! Шмат энергіі, выдумкі, гумару ўклалі ў гэтыя мерапрыемствы нашы выпускнікі. Вось каго не трэба было доўга ўгаворваць: яны прыходзілі літаральна па першаму закліку і рабілі ўсё на выдатна.

Ёсць пэўныя зрухі і ў рабоце спартыўнага сектара. Нашы каманды нядрэнна выступалі на універсітэцкіх і гарадскіх спаборніцтвах. Нямала давялося папрацаваць Генадзю Дабравольскаму, каб знайсці аматараў спорту, сабраць каманды.

На добрым рахунку ва універсітэце нашы будаўнічыя і сельскагаспадарчыя атрады.

КАМЕРТАРЫЙ ЧАЦВЕРТЫ

— Якія мерапрыемствы, праведзеныя камітэтам камсамола, вам запомніліся?

К. ЛУКАШОЎ (III курс): Безумоўна, дні факультэта. Яны сталі сапраўдным святам. Але мне здаецца, што заслуга камітэта камсамола тут крыху перабольшана, таму што галоўную ролю ў іх арганізацыі адыгралі сёлетнія выпускнікі і члены клуба «Пятніца».

Я паспрабаваў даць ацэнку таму багажу практычнага вопыту, які назапасіў за год сваёй работы ў камітэце камсамола. Чаму я так стараўся завастрыць увагу на недахопах? Таму што, каб ісці наперад, трэба абавязкова азірнуцца назад. А яшчэ — каб аблегчыць задачу новаму саставу камітэта. Магчыма, улічваючы нашы недахопы, яны пазбегнуць памылак у сваёй рабоце.

Маналог запісала
З. АЛЯШКЕВІЧ.

ФРАГМЕНТЫ

КАЛЕКТЫЎНЫ ЗДЫМАК

Жыў студэнт. Здаецца, нядрэнна. У дэканаце, калі даводзілася трапляць, мог гадзінамі слухаць павучальныя пропаведзі і — ні гуку. На лекцыі, калі ўжо зусім не пад сілу было ўлоўліваць выкладчыцкую цягучку, мірна пасапваў. У чарзе да ўрача, калі здаралася захварэць, толькі зрэдку пакашліваў ды хусцінкай сарамліва закрываўся. У інтэрнаце, калі з вячэрняга сеанса ў «начлежку» вяртаўся, бабульцы ветліва ўсміхаўся. Нічога сабе жыў. Не палохаўся, не скардзіўся... Пакуль не пайшла па ўсёй краіне гэтая недарэчная хваля мітынгаў, забастовак. Цяпер вось — форум. Каму ён патрэбны і якім будзе? Ці здолее з латак на «адзежы» нашага грамадства змайстраваць кафтан для вышэйшай адукацыі, і ці патрэбна гэта?

— Форум, нібы фотаздымак, павінен адлюстраваць студэнцтва такім, якое яно ёсць. І нішто — страта веры і інфантылізм, пасіўнасць і канфармізм не павінна быць пакінута за кадрам, за радкамі рэзалюцыі,— лічыць інструктар ЦК ВЛКСМ Уладзімір Касмярэшкін.

Студэнцкую канферэнцыю (ва універсітэце яна адбылася 18 кастрычніка) мы таксама імкнуліся «сфатаграфаваць». Цяжка рабіць калектыўны здымак. Вось і ў нашага фотакарэспандэнта ён, на жаль, не атрымаўся. І ўсё ж...

Інфантылізм і пасіўнасць — гэта пра нас. Па палажэнню, распрацаванаму аргкамітэтам па падрыхтоўцы да студэнцкага форума, кожны факультэт дэлегіраваў на канферэнцыю пятнаццаць чалавек. Былі незадаволеныя: адкуль, маўляў, узялася такая лічба, чаму не больш? Таму, паважаныя, што пры ўсёй зацікаўленасці факультэтаў у зале сядзела ні многа ні мала — восемдзесят чалавек.

Канкурэнцыя — гэта не для нас. Пры вялікай колькасці саперні́каў — 13 чалавек — з'явілася, магчыма, самаўпэўненая цыдулка ў прэзідыум: «Паколькі сярод вылучаных кандыдатаў не знаходзіцца пакуль вартых увагі, прапаную сваю кандыдатуру...» А ваганні ля паперак з прозвішчамі — як гэта, каб на пяць нашкрэбці?

Прабачце, але і з дэмакратыяй мы яшчэ не на адным шляху, калі ўмудрыліся за некалькі гадзін дайсці ў ацэнцы праграм ад слоў «гэта неперакана́ўча» да сцвярджэння «гэта глупства».

Як бы там ні было, але пры дзейснай дапамозе асноўных удзельнікаў дыскусіі — студэнтаў юрыдычнага і гістарычнага факультэтаў з кандыдатамі мы пазнаёміліся. У выніку тайнага галасавання вылучылі дэлегатамі на Усесаюзны студэнцкі форум Уладзіміра Хвалея (юрфак) і Вадзіма Валодзіна (філфак), на Рэспубліканскі — Алесю Сёмуху (ТБМ), Генадзя Грынчыка (фізфак), Ігара Верхаводзьку (юрфак).

Цяпер у іх ёсць шанц. Шанц заявіць аб сабе. І хоць выбаршчыкі і дэлегаты адмовіліся ад наказаў, ад сябе дадаём:

— Рэальнымі і жыццёвымі будуць толькі тыя рашэнні, што ўлічваюць усе бакі студэнцкіх праблем (прасцей, зразумела, заняць экстрэмісцкую пазіцыю, чым прапанаваць аптымальнае рашэнне).

З. МАРАВА.
Фота С. ГРЫЦА.



ПРАЗ РАСЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

Па-за гульнёй

«З ПРАВІЛАМІ ПРАЖЫВАННЯ Ў ІНТЭРНАЦЕ АЗНАЁМЛЕНЫ...»

Перад гэтым непрыкметным радком у ордэры на засяленне ў інтэрнат падпісваецца кожны іншагародні студэнт. І мала-верагодна, што задумваецца над ім. З вачэй далоў і з сэрца вон.

Сёння не патрэбна валодаць выдатным зрокам ці занадта жаласлівым сэрцам, каб убачыць і адчуць, якое цяжкае становішча стварылася з засяленнем іншагародніх ва ўсіх універсітэцкіх інтэрнатах. З'явілася новая катэгорыя навучэнцаў — «бяздомныя». Гэта тыя, хто бачыць вакзал будучым месцам прытулку. Жыццё на прыватнай кватэры не ўсім па кішэні, ды і паспрабуй яшчэ адшукай яе ў Мінску.

Студэнты механіка-матэматычнага факультэта засяляюцца ўжо другі месяц. Некаторыя будуць трызніць аб месцы ў інтэрнаце яшчэ год. Жыльцы дванаццатага паверха не хутка ўселяцца ў адрамантаваныя пакоі. Хто вінаваты ў тым, што значная частка студэнтаў мехмата з выпісанымі ордэрамі бадзяецца невядома дзе; што інтэрнат, у які зараз яны так імкнуцца, «ляжыць у развалінах», як вобразна заўважыў другі камендант «сямёркі» Барыс Паўс?

Аб'яднаны сход прафсаюзнай арганізацыі механіка-матэматычнага факультэта з удзелам адміністрацыі інтэрната № 7, дэкана мехмата Л. П. Прымачука і прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы У. І. Тарасевіча паспрабаваў адказаць на гэтыя пытанні.

З правілаў пражывання ў інтэрнаце:

«Пражываючым у інтэрнаце забараняецца:

— пакідаць пабочных асоб на начлег без дазволу;

— з'яўляцца ў нецвяразым стане, распіваць спіртныя напіткі, курыць...»

Не злічыць выпадкаў крадзяжу ў «сямёрцы». Зусім нядаўна невядомыя «вынеслі» амаль поўнасцю ўвесь пакой 1117. Па той жа прычыне (перадачы пропуска чужой асобе) у інтэрнаце паўгода пражываў небяспечны злачынца-рэцыдывіст, на якога быў аб'яўлены ўсесаюзны вышук. Ужо ў гэтым навучальным годзе некалькі дзён запар выклікалася міліцыя, каб навесці парадак. Цікава, што потым «пацярпеўшыя» студэнты прыходзяць да адміністрацыі і папракаюць: «Чаму ў вас такі дрэнны прапускны рэжым?». У вас?! А можа ў нас?

У нас трынаццаты паверх — «забароненая зона». Таму што там проста небяспечна ўвечары хадзіць. У нас далёка да ідэальнага парадку ў блоках і пакоях. І, нарэшце, мы вырашаем, як павінен працаваць інтэрнат.

Адміністрацыя інтэрната ў асобе першага каменданта Алы Мікалаеўны Нурметавай і другога каменданта Барыса Паўса спрацавалі сёлета жорстка: «Не засяляць студэнтаў за парушэнне элементарных норм пражывання ў інтэрнаце»,— такі быў іх кароткі вердыкт. Ён яшчэ ў маі набыў форму «чорнага спіса», куды трапіла значная частка іншагародніх студэнтаў мехмата. Менавіта па гэтым спісе распаліліся дэбаты на сходзе.

Тыя, хто пражывае ў інтэрнаце, маюць права:

— удзельнічаць цераз студсавет у пытаннях удасканалення жыллёва-бытавога забеспячэння.

Шмат хто з мехматаўцаў у інтэрнаце № 7 скардзіцца на «дыктатуру» Паўса. А што вы можаце прапанаваць узамен? Каб не білі шкло на паверхах? Каб не гвалтавалі прама ў блоках дзяўчат? Каб можна было пайсці на трынаццаты паверх у любы час дня і вярнуцца жывым і здаровым?

З якой нагоды, цікава, шмат хто з хлопцаў пастараўся перасяліцца з трынаццатага паверха ўніз? У аператыўным атрадзе інтэрната ёсць нават радыёфізікі, але вось мехматаўцы...

Згодзен, шмат спрэчнага ў тых жа «чорных спісах». Нават у іх вывешванні вясной. Без подпісу, без пячаткі. І без абмеркавання з прафсаюзным бюро мехмата. Але чаму за цэлых пяць месяцаў нічога не было зроблена самімі студэнтамі? Тлумачэнне простае: на 31 мая 750 студэнтаў не адпрацавалі па шэсць гадзін па добраўпарадкаванню інтэрната. І кожны з гэтых 750 думаў: няўжо ўсіх іх не заселяць, няўжо ўсё не паўторыцца з засяленнем, як у мінулым годзе? Як пяць, дзесяць гадоў назад. Як у нашых студэнцкіх інтэрнатах склалася спрадвеку.

Цяпер прафсаюзнаму бюро мехмата патрэбна было вырашыць, каму засяліцца зноў з гэтай «чорнай» катэгорыі, а каму застацца за бортам? Таму што проста так іх ужо ніхто не заселіць.

На сходзе шмат гаварылася аб студэнцкім самакіраванні, аб самастойнасці ў прыняцці рашэнняў, а таксама аб вельмі працяглым рамонце дванаццатага паверха. Асэбіста мне вельмі шкада мехматаўцаў, якія жывуць на «адрамантаваным» адзінаццатым. Ён вельмі нагадвае казематы і знешне, і ўсярэдзіне. І таксама, акрамя абурэння, да трох абяцанняў У. І. Тарасевіча ў мяне нічога не ўзнікае. З лета ўжо цягнецца гора-рамонт, які проста пушчаны на самацёк. Уладзімір Іванавіч запэўніваў, што яшчэ зімой «будзе ўсё добра»...

Але. Чаму няма такога становішча на ніжніх паверхах таго ж інтэрната? Чаму няма ніякіх нараканняў з боку студэнтаў-хімікаў з інтэрната № 2, дзе нядаўна таксама праводзіўся рамонт? Справа, відаць, не ў адных будаўніках і прарэктары?

Былы ўжо старшыня прафсаюзнага бюро мехмата Снежана Русецкая:

— Першы, а магчыма апошні раз, бо хутка пройдзе студэнцкі форум, так лагодна размаўляла з намі адміністрацыя. Да гэтага асноўны метад размовы быў накшталт: «На кватэры вас усіх трэба».

А як вы думаеце, паважаныя мехматаўцы, хто будзе вучыць гэтую адміністрацыю размаўляць з вамі на роўных?

...Ігрок, які апыняецца на футбольным полі па-за гульнёй, проста не адчувае, што яго ўяўныя «апекуны»-саперні́кі пакінулі яго далёка ззаду. І што пры ўсіх сваіх бамбардзірскіх вартасцях умовы гульні дыктаваць ужо будзе не ён.

Літаральна на днях прайшлі выбары новага прафсаюзнага актыву мехмата. Пачынаецца новы «чэмпіянат». Новаму саставу прафбюро «бамбардзірскіх» якасцей не пазычаць. Толькі вось ці хопіць яму ўмення разабрацца ў складанай ігравой сітуацыі?

P. S. Цяпер тыя, хто застаўся «бяздомным», зусім па-іншаму глядзяць на свой ордэр, на той самы непрыкметны радок на другім баку гэтай «паперкі», як часта мы яго называем, не адчуваючы велічы і прыгажосці. Ім гэта здорава адгукнулася. Лепш позна, чым ніколі. Але ведаеце, якая самая папулярная фраза была на гэтым сходзе? «Калі б я ведаў раней...»

А. КОКТЫШ.

МІКРАФОН

КРАМОЛЬНАЯ ДУМКА?

Гэта несправядліва! Усім вядома, як абвастрылася апошнім часам ва універсітэце праблема недахопу месцаў у інтэрнаце. У той жа час ёсць сярод мінскіх ВНУ такія, дзе студэнты пануюць па дваіх у пакоі. Паспрабаваць бы аб'яднаць фонд і размяркоўваць месцы ў інтэрнатах гарадскім студэнцкім саветам. А што, калі такім жа чынам абысціся з фінансамі на будаўніцтва новых інтэрнатаў і вучэбных корпусаў?

(З выступлення кандыдата ў дэлегаты на форум Віктара ПАНЦЯЛЕЕВА).

ДАРЭЧЫ,

з 27 па 30 кастрычніка ў Ленінградзе адбудзецца міжрэгіянальная сустрэча дэлегатаў Усесаюзнага студэнцкага форуму. Гэта нагадвае...

Гульні дарослых у сходы па акругах? Генеральную рэпетыцыю? Савет у Філях?

Як лічыце, ці зручна адапціравацца ва ўмовах сценкі, якая ідзе на сценку? Адну з іх доўгія гады ніхто не адважваўся прабіць, другая ўзводзілася похапкам з асобных цаглінак, кожная з якіх жыве сваім розумам.

Падлічылі? Нязручна!!! Засталося толькі выкарыстаць тэлефоны для даведак: 278-15-66, 278-51-00 (у Ленінградзе).

СТУДЭНТ-КАМСАМОЛЕЦ?

Перш за ўсё форум павінен падзяліць гэтыя паняцці і даць будучым інтэлігентам (многія з нас праз пэўны час змогуць вызначаць палітыку краіны) гарантаванае права на палітычную дзейнасць у розных арганізацыях, што не супярэчаць нашай Канстытуцыі.

(З выступлення кандыдата ў дэлегаты на форум Вадзіма ВАЛОДЗІНА).

СТЫПЕНДЫЮ ЎСІМ?!

Без выключэння! Двоечніку таксама патрэбна мець хоць мінімальныя даходы. Пасля вучобы студэнт, як вядома, ідзе працаваць — тады і зможа вярнуць запазычанасць. Ці гэта не адзін з прынцыпаў перманентнасці адукацыі — прадпрыемства прадастаўляе ВНУ грошы на стыпендыю і атрымлівае спецыялістаў? Магчыма дыферэнцыяцыя: той, хто «не згаджаецца» ў час сесіі на здавальняючыя адзнакі, атрымлівае 40 працэнтаў ад сярэдняй стыпендыі.

(З выступлення кандыдата ў дэлегаты на форум Генадзя ГРЫНЧЫКА).

ДОБРА ЗАБЫТАЕ СТАРОЕ?

Нашто рабіць з сябе пакутнікаў? Мы самі гэты шлях у навуку добраахвотна абралі. І (я займаўся даследаваннем) многія дакументы, якія рэгламентуюць жыццё ВНУ, утрымліваюць выдатныя палажэнні. Бяда ў тым, што не агаворваюць санкцыі для тых, хто гэтыя палажэнні парушае. Альбо новыя дакументы неабходны, альбо папраўкі да старых...

(З выступлення кандыдата ў дэлегаты на форум Сяргея РАКА).

БЮРАКРАТЫЧНЫЯ ГУЛЬНІ?

Запрасіць на форум адказных, кампетэнтных і валодаючых шырокімі паўнамоцтвамі работнікаў Дзяржкамітэта па народнай адукацыі. Дамагчыся, каб студэнты ўдзельнічалі ў пасяджэннях калегіі Дзяржкамітэта і міністэрстваў. Гэта мінімум, гэта абавязковая ўмова для паспяховай работы форума.

(З выступлення кандыдата ў дэлегаты на форум Ігара ХІЖНЯКА).

КРАМОЛЬНАЯ ДУМКА?

Адзінае, што можа зрабіць форум,— стварыць незалежны прафсаюз студэнтаў, які... асуджаны на гібель. Ён абавязкова зачне канфлікт са студэнцкімі прафсаюзамі, якія маюць значную матэрыяльную базу і прававы статус. Ды й па існуючым палажэнні аб добраахвотных таварыствах такая арганізацыя афіцыйна і заканадаўча прынята не будзе, калі... не выйсці ў ВЦСПС з прапановай аб вылучэнні самастойнага прафсаюза работнікаў вышэйшай школы.

Цяперашняму прафсаюзу студэнты не давяраюць — ён не займаецца абаронай іх правоў. Для чаго, дарэчы, прызначаны.

(З выступлення кандыдата ў дэлегаты на форум Уладзіміра ХВАЛЕЯ).

Праект

Праграма дзеянняў камсамола Белдзяржуніверсітэта

I. Змены ў арганізацыйнай і фінансава-гаспадарчай дзейнасці

— Са снежня 1989 года правесці ў камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна перарэгістрацыю членаў ВЛКСМ. Камітэтам камсамола БДУ і факультэтаў распрацаваць план перарэгістрацыі.

— Звярнуцца ў рэктарат, партком з прапановай аб выключэнні пункта аб членстве ў ВЛКСМ і подпісу сакратара камсамольскай арганізацыі з вытворчых характарыстык і анкет.

— Даць права членам ВЛКСМ аб'ядноўвацца ў камсамольскія арганізацыі не толькі па вытворчаму прынцыпу, але і па інтарэсах: на базе палітклубаў, клубаў інтэрнацыянальнай дружбы, калектываў мастацкай самадзейнасці і г. д.

— Падрыхтаваць і шырока абмеркаваць эфектыўную праграму школы камсамольскага актыву універсітэта, у якой прадугледзець дзелавыя гульні, сустрэчы са спецыялістамі па прамоўніцкаму майстэрству, псіхалогіі і г. д.

— Камітэту камсамола універсітэта вывучыць мэтагоднасць адкрыцця разліковага рахунку ў банку. Даць камітэтам камсамола факультэтаў субрахункі з правам самастойнага расходвання ўласных грошай.

— Выйсці ў вышэйстаячыя камсамольскія органы з прапановай аб прадастаўленні вузаўскаму камсамолу права пакідаць у сваім распараджэнні да 100 працэнтаў усіх членскіх узносаў, самастойна ўстанаўліваць перыядычнасць іх уплаты.

— Не менш 50 працэнтаў узносаў пакідаць у распараджэнні камсамольскіх арганізацый факультэтаў. Даць права камітэтам камсамола факультэтаў і арганізацыі супрацоўнікаў самастойна ўстанаўліваць пастаянную ці часовую аплату сакратару камітэта камсамола.

II. Цэнтр палітычнага рэагавання

— Стварыць пры камітэце камсамола універсітэта цэнтр палітычнага рэагавання. Яго задачы:

а) падбор і вылучэнне кандыдатаў у народныя дэпутаты, у дэлегаты розных форумаў, з'ездаў і канферэнцый;

б) садзеянне ў выпрацоўцы праграм для кандыдатаў у дэпутаты;

в) арганізацыя падтрымкі кандыдатаў у перадвыбарны перыяд;

г) падрыхтоўка прапаноў у дзяржаўныя, грамадскія арганізацыі і іх органы;

д) вывучэнне і абагульненне меркаванняў камсамольцаў універсітэта па актуальных праблемах краіны, рэспублікі, універсітэта.

— Цэнтру палітычнага рэагавання аказваць прававую дапамогу і праводзіць кансультацыі са студэнтамі па тых пытаннях, якія іх цікавяць.

— З мэтай паляпшэння інфармацыі ў камсамольскай арганізацыі БДУ выйсці з прапановай у рэктарат аб радыёфікацыі універсітэта.

III. Развіццё студэнцкага самакіравання

— Камітэту камсамола неабходна актыўна ўключыцца ў распрацоўку Статута БДУ імя У. І. Леніна, у якім, на наш погляд, патрэбна:

а) дакладна вызначыць паўнамоцтвы савета працоўнага калектыву, вучонага савета універсітэта, студэнцкай фракцыі ў гэтых органах;

б) правесці размежаванне функцый вышэйшых органаў універсітэта і грамадскіх арганізацый.

— Закончыць абмеркаванне праекта аб студэнцкім савеце факультэта і універсітэта і вынесці яго на зацвярджэнне вучонага савета БДУ імя У. І. Леніна.

— У другой палове лістапада правесці выбары ў студэнцкія саветы факультэтаў.

— Камітэтам камсамола універсітэта і факультэтаў будаваць свае ўзаемаадносіны з іншымі грамадскімі арганізацыямі на дагаворных пачатках.

IV. Удасканаленне вучэбнага працэсу

— Камітэтам камсамола БДУ імя У. І. Леніна, факультэтаў сабраць і прааналізаваць прапановы студэнтаў і выкладчыкаў па паляпшэнню вучэбнага працэсу і навуковадаследчай дзейнасці, падрыхтаваць рэкамендацыі ў вучоныя саветы універсітэта і факультэтаў.

— Звярнуцца ў вышэйстаячыя органы з прапановамі:

а) пашырыць правы Белдзяржуніверсітэта такім чынам, каб вучоны савет вызначыў падбор дысцыплін (абавязковых і факультатыўных), вучэбных праграм, а таксама формы кантролю ведаў з улікам спецыфікі ВНУ;

б) дазволіць універсітэту фарміраваць план набору з улікам матэрыяльна-тэхнічнай базы;

в) устанавіць добраахвотнае наведванне заняткаў на ваеннай кафедры. Стымулам павінна быць надбаўка да стыпендыі (са сродкаў Міністэрства абароны СССР).

— Устанавіць спецыяльныя прэміі камітэта камсамола БДУ для ўзнагароджання выкладчыкаў — пераможцаў конкурсу студэнцкіх сімпатый.

— Арганізаваць работу «круглых сталоў», прысвечаных вывучэнню перадавога вопыту сістэмы вышэйшай адукацыі замежных краін.

— Вывучыць магчымасць выпуску па выніках навучальнага года двух зборнікаў лепшых студэнцкіх работ (па прыродазнаўчых і гуманітарных навуках).

V. Сацыяльна-эканамічныя праблемы

Выйсці з прапановай:

а) аб разгледжанні магчымасці даплат з дзяржаўных і прафсаюзных фондаў студэнтам і маладым спецыялістам, якія жывуць на прыватных кватэрах;

б) аб штогадовым перагляду памераў выплаты стыпендый і льгот для студэнтаў і маладых спецыялістаў у адпаведнасці з рэальнымі паказчыкамі пражытачнага мінімуму;

в) аб ліквідацыі ўсіх абмежаванняў пры ўладкаванні студэнтаў на работу па сумяшчальніцтву;

г) аб павелічэнні памераў камандзіровачных для студэнтаў на перыяд практыкі да агульнадзяржаўнага ўзроўню.

Выкарыстоўваючы магчымасці Маладзёжнага гаспадарчаразліковага прадпрыемства «Універсітэт», распрацаваць праграмы:

— «Студэнцкі сервіс — рукамі студэнтаў»;

— «Навуковая і тэхнічная творчасць студэнтаў».

Мэта гэтых праграм — даць студэнтам магчымасць зарабіць, у тым ліку і працуючы па профілю сваёй будучай работы.

VI. Работы, не звязаныя з асноўнай спецыяльнасцю

— Прыцягненне студэнтаў на работы, не звязаныя з іх асноўнай спецыяльнасцю, павінна быць арганізавана ці толькі на добраахвотных прынцыпах (студэнцкія атрады), ці на аснове рашэння савета працоўнага калектыву БДУ імя У. І. Леніна, які вызначае базавыя курсы для ўдзелу ў сельскагаспадарчых работах.

— Выкананне работ, не звязаных з асноўнай спецыяльнасцю, ажыццяўляецца строга на дагаворнай аснове з прымаючымі арганізацыямі, якія нясуць усе расходы па арганізацыі гэтых работ.

— Студэнты, якія адпрацавалі больш як паўтара месяца ў ЛСА або дзве змены ў піянерскіх лагерах, вызваляюцца ад сельскагаспадарчых работ.

VII. Будаўнічыя атрады

Выйсці ў вучоныя саветы універсітэта і факультэтаў з прапановамі:

а) планаваць летнюю практыку з улікам інтарэсаў студэнтаў, якія жадаюць працаваць у будаўнічых атрадах;

б) пашырыць самастойнасць штаба працоўных спраў універсітэта і камандзіраў ЛСА у выбары прымаючых арганізацый і ў заключэнні гаспадарчых дагавораў. Унесці адпаведныя змены ў нарматыўныя дакументы;

в) вызначыць права камітэтаў камсамола універсітэта і факультэтаў у выкарыстанні грашовых сродкаў, якія паступілі ад дзейнасці студэцкіх атрадаў;

г) галоўную адказнасць за якасць падрыхтоўкі і дзейнасці студэнцкіх атрадаў ускласці на камандзіраў ЛСА. Вырашыць пытанне аб матэрыяльным узнагароджанні іх за работу ў падрыхтоўчы перыяд.

VIII. Інтэрнаты

— Распрацаваць і шырока абмеркаваць праект новых Правілаў пражывання ў інтэрнаце. Прадугледзець:

а) абавязковасць заключэння дагавораў жыхароў з адміністрацыяй;

б) выдзяленне пакояў студэнтам на пяць гадоў;

в) магчымасць рамонту памяшканняў сіламі саміх жыхароў з забеспячэннем іх адпаведнымі матэрыяламі;

г) усталяванне платы за жыллё з улікам яго якасці і плошчы, летніх канікулаў;

д) абавязковасць адпрацоўкі жыхарамі праграмы па добраўпарадкаванню інтэрнатаў;

е) адказнасць студэнтаў за стан перададзенай ім маёмасці.

Вынесці на пасяджэнне ствараемых вышэйшых органаў універсітэта пытанне аб стане грамадскага харчавання ў БДУ. Разгледзець магчымасць адкрыцця ў галоўным корпусе кафэтэрыя.

IX. Адпачынак

— Удасканальваць дзейнасць Маладзёжнага цэнтра аматарскіх аб'яднанняў матэрыяльнай і маральнай падтрымкай ствараемых аб'яднанняў па інтарэсах, відэасалонаў.

— Стварыць пры Маладзёжным цэнтры аматарскіх аб'яднанняў агульнаўніверсітэцкую відэатэку і дыскатэку.

— Пашырыць магчымасці універсітэцкага пункту пракату спартыўнага і турысцкага інвентару.

— З улікам рэальных магчымасцяў пашырыць міжвузаўскі турыстычны абмен.

— Падрыхтаваць праграму пашырэння замежных паездак на безвалютнай аснове. Размеркаванне гэтых путёвак весці галосна, на конкурснай аснове.

X. Развіццё беларускай нацыянальнай культуры

— Арганізаваць пры камітэце камсамола БДУ імя У. І. Леніна асветніцкі клуб. Мэта яго — вывучэнне і прапаганда гісторыі і культуры Беларусі.

— Сумесна з іншымі зацікаўленымі арганізацыямі адкрыць ва універсітэце курсы беларускай мовы.

— Распрацаваць праграму камітэта камсамола па прапагандзе беларускіх нацыянальных традыцый, абрадаў, сімволікі. У красавіку 1990 года правесці на базе універсітэта фестываль беларускага фальклору, выпусціць серыю плакатаў і значкоў.

— У рабоце камітэта камсамола універсітэта пашырыць выкарыстанне беларускай мовы.

ЛІСТ ПРА ЛЕТА

Былі і праблемы...

Спачатку я хацеў расказаць, які цудоўны быў наш атрад «Мінск-89», што выязджай у ГДР, як усім там было добра і весела. Але потым вырашыў не рабіць гэтага. Хоць не думаю, што каму-небудзь з членаў атрада не спадабалася арганізацыя працы, культурная праграма ці экскурсіі ў многія гарады ГДР.

Былі і праблемы, і большасць з іх здаюцца мне тыповымі для ўсіх атрадаў.

Першае, з чым сутыкнуліся мы яшчэ ў Мінску,— дрэнна афармлены дагавор, дзе не ўсё было агаворана. Мы не ведалі нават, хто яго заключыў.

Фарміраванне атрада таксама прайшло на ўзроўні не студэнтаў, а камсамольскіх лідэраў (ці некага яшчэ), таму некаторым байцам былі невядомы яго асноўныя мэты: яны разлічвалі толькі адпачываць, а на справе давялося і папрацаваць.

Мяркую, кожную кандыдатуру для атрада, які будзе працаваць у замежнай краіне, трэба і магчыма абмяркоўваць галосна, а не ў кулуарах. Не ўяўляю, што да такога пытання студэнты адносіліся б пасіўна.

Я не збіраюся любой цаной апраўдваць неабходнасць правядзення сацыялістычнага спаборніцтва паміж атрадамі. Ведаю толькі: усведамленне перамогі, дарованае нам першым месцам у такім спаборніцтве, было добрай падтрымкай атраду, і кожны атрымаў ад гэтага маральнае задавальненне, асабліва ў развітальны вечар.

Атраду, які зойме наша месца ў наступным годзе, я хачу пажадаць поўнага ўзаемаразумення, добрага настрою і шмат сяброў у ГДР.

В. КАНАВАЛАЎ,
камісар атрада «Мінск-89».

ДЛЯ ШЯБЕ

ТОЛЬКІ ДЛЯ ХЛОПЦАЎ

БАГАТЫРская наша сіла

Мяне сустрэў звон жалеза, свіст цяжкага дыхання і хлопцы ўзорнага выгляду, якія лёгка выжымалі штангі, гіры, працавалі на трэнажорах, з гантэлямі, дыхалі ў «трубку», узважваліся — займаліся кожны сваёй справай. Ды так захоплена, што нават на мае фотаапараты ніхто не звярнуў увагі. «Сур'ёзныя хлопцы»,— падумаў я, і, як высветлілася потым, гэта не разыходзілася з ісцінай. Ішла падрыхтоўка да чэмпіянату СССР па гіравому спорту, які адбудзецца 17—19 лістапада ў Яраслаўлі.

У суседняй зале займаліся навічкі, якія прыйшлі ў секцыю атлетычнай гімнастыкі ў гэтым і мінулым гадах. Віктару Фёдаравічу Кавалёву — трэнеру секцыі па гіравому спорту, цяжкай атлетыцы і атлетычнай гімнастыцы, даводзілася не раз падыходзіць да іх і даваць парады, як выконваць практыкаванні. Больш вопытныя займаліся самастойна. Так хацелася дапамагчы ім, калі яны выконвалі заданні з вялікімі цяжкасцямі, і калі (ведаю па ўласнаму вопыту) узнікае неадольнае жаданне скінуць з сябе гэты груз. «Цяжка ў вучобе, ды лёгка ў баі» — гэта галоўнае для іх у такія моманты.

Прапанавалі і мне. Хіба ж можна такія жарты над людзьмі строіць?! Цяпер я гатовы гару звярнуць.

Недалюблівае наш брат студэнт заняткі спортам, усё ў яго часу не хапае, а добра было б знайсці яго. Вось і я падумаў: «Нядрэнна было б заняцца чым-небудзь».

А. МАЖАРА,
студэнт факультэта журналістыкі.

САМ-НАСАМ

Як застацца старой дзевай?

Гэтыя парады — для тых дзяўчат, якія паводзяць сябе так, быццам бы сапраўды мараць застацца ў старых дзевах. Спадзяёмся, яны дапамогуць ім знайсці памылкі ў сваіх дзеяннях.

1. Будзьце цвёрда ўпэўнены, што вам наканавана ўсё жыццё быць адной. Песімізм, які авалодаў вамі, зробіць сваю справу і непазбежна прывядзе да паражэнчага настрою, які разам з вашым тужлівым выглядам, будзьце ўпэўнены, здолее адпужаць любога мужчыну.

2. Распараджайцеся сваім асабістым жыццём дакладна так, як гэта пішуць у раманах пра старых дзеў: размовы з сяброўкамі, прагулкі з пляменніцай, вячэра перад тэлеэкранам, генеральная ўборка ў выхадны і г. д.

3. Як толькі можаце, імкніцеся быць «захавальнікам таямніц» усіх сваіх знаёмых, кожнаму дапамагайце, давайце парады і «ахоўвайце» шлюбы сяброўак.

4. Знайдзіце сабе сяброўку (па магчымасці прыгажэйшую за вас), ва ўсім ёй даверцеся і праводзьце з ёй увесь вольны час.

5. Абыходзьце касметычныя салоны і цырульні, дазваляйце сабе ўсялякія ласункі і ні ў якім разе не купляйце абноўкі, на вас жа ўсё роўна ніхто не зверне ўвагі.

6. На людзях паводзьце сябе, як незалежная інтэлектуалка, а з мужчынамі будзьце як мага больш высакамернай, і любую спробу флірту з абурэннем адхіляйце як нешта амаральнае і непрыстойнае.

7. Жывіце ў шчаслівай упэўненасці, што існуе «ідэальны мужчына», які чакае толькі вас. Ніколі не адступайце ад сваіх ідэалаў у адносінах характару, знешняга выгляду і фінансавых магчымасцей чакаемага «прынца».

8. Пазбягайце мужчын і ніколі не сумнявайцеся ў правільнасці сваіх жыццёвых прынцыпаў. Наадварот — няхай увесь свет прыстасоўваецца да вас.

З ЧАСОПІСА «СВЕТ САЦЫЯЛІЗМУ» (ЧССР).
Фота С. ГРЫЦА.

ЗАВОЧНАЯ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

Каб навучыцца стэнаграфаваць, патрэбна... стэнаграфаваць. Пакладзіце перад сабой сшытак (край сшытка і край стала павінны складаць вугал 45°) і вазьміце ручку. Уявіце, што вы ў класе, а наш дапаможнік, што ляжыць перад вамі,— гэта класная дошка. Усё, што вам пішуць на дошцы, вы звычайна занатоўваеце ў сшытак. Так рабіце і зараз. Толькі машынапісны тэкст перапісваць не трэба. Гэта проста тлумачэнні.

ПРА ЛІТАРЫ І ЗНАКІ

Так павялося: калі гавораць пра літары — маюць на ўвазе звычайнае пісьмо, а калі размова ідзе пра знакі — тады ўжо падразумяваюць пісьмо стэнаграфічнае.

1. Будзем знаёмыя!



Гэта мы, стэнаграфічныя знакі. Паспрабуйце, як мы пішамся. Бачыце, мы зусім простыя, не тое, што літары звычайнага алфавіту — грувасткія і нязграбныя, як сапраўдныя дыназаўры, асабліва Ж, Ф, Щ, Ю... І як іх толькі першакласнікі вывучаюць? Вось ужо, напэўна, пакутуюць!

З нашым алфавітам працаваць цікава, захапляльна. Сярод нас ёсць такія знакі, якія замяняюць адразу дзве ці тры літары і нават цэлыя часткі слоў (прыстаўкі, корні, канчаткі):



Гэтыя знакі, магчыма, здаліся вам некалькі нязвыклымі. Аднак заўважым, што падобнае сустракалася і ў звычайным пісьме. Успомнім пра літару Щ.

Вопытны стэнограф можа пісаць і на чыстай паперы, і ў многіх падручніках стараюцца прытрымлівацца гэтай традыцыі. Але вось у нас бываюць і парушэнні. Растлумачым, чаму. Мы хацелі напісаць дапаможнік проста і зразумела, лёгка і захапляльна, таму запрасілі журналістаў і пісьменнікаў. А ў іх лічыцца вельмі непрыстойным паўтараць адно слова, ды яшчэ ў адным і тым жа сказе. Як толькі сыдуцца два словы «знакі», так нашы аўтары адразу ж папраўляюць адно з іх на сінонім — «літары». Ды і наогул стараюцца больш чаргаваць гэтыя словы. Але па тэксту, які яны склалі, добра зразумела, аб чым гаворыцца. Дык давайце ж прабачым іх пісьменніцкія «дзівацтвы» і пачнем першы ўрок.



Па вышыні стэнаграфічныя знакі можна падзяліць на тры групы.



Малые:



Нам давядзецца кантраляваць знакі не толькі па вертыкалі, але і па гарызанталі. Напрыклад, галосную Е. Таму лепш за ўсё пісаць на паперы ў клетку.

2. К і кампанія



Пакуль мы толькі знаёмімся са знакамі стэнаграфіі. Вы іх, безумоўна, яшчэ не запомнілі, ды гэта не абавязкова і рабіць: зубрэнне нам зусім непатрэбна. Знакі засвойваюцца лёгка і хутка пры выкананні практыкаванняў.

Хоць стэнаграфічныя знакі вельмі простыя, але ў гэтай прастаце і складанасць свая ёсць: знакі нельга пісаць рознымі варыянтамі, як літары звычайнага пісьма.

Кожны знак пішацца па цэламу радку. Вось так:



Не рабіце надта вялікія закругленні. Літара П у два разы вышэй, чым К, але закругленне не павялічваецца прапарцыянальна знаку. Тым больш не варта павялічваць яго ў літары С. Усе закругленні аднолькавыя.



Сачыце таксама, каб замест закруглення не атрымаўся востры вугал:



Закругленні не павінны заканчвацца рухам направа. Яны заканчваюцца рухам уверх, туды, дзе будзе пачынацца наступны знак:

Бачыце, знакі хоць і недакладныя, але ўжо тры недакладнасці мы знайшлі. А ў літары С іх бывае яшчэ больш.

Не пішыце літару С са зваротным нахілам:



Зваротны нахіл атрымліваецца з-за таго, што вы, толькі пачаўшы напісанне літары, адразу робіце закругленне. А патрэбна хоць крышачку прайсці ўніз, у такім жа напрамку, як і ў пачатку літары К, П.

Загінаць пачатак літары С направа таксама не раім:

3. Літары-хамелеоны



За літарамі Л і Д сачыць патрэбна ўважліва: яны так і хочуць прыняць выгляд іншых знакаў.

Як пачынаюцца Л і Д? Пачатковая лінія павінна ісці ўверх (з нахілам, зразумела), але не направа. Калі ў самым пачатку рука ідзе направа, то пятля атрымліваецца гарызантальная, літара крывіцца, горбіцца:



Дзе пачынаюцца Л і Д? Пачатак літары Л прыкладна ў сярэдзіне радка, паміж асноўнай лініяй і кантрольнай. Літара Б пачынаецца ад кантрольнай лініі. Недапушчальна такое павелічэнне ці памяншэнне пятлі, калі Л і Д ператвараюцца ў іншыя знакі:

Напісанняў, якія мы назвалі дапушчальнымі, таксама старайцеся пазбягаць. Ад дапушчальных да няправільных застаецца адзін крок.

Закругленні ў ніжняй частцы Л і Д такія ж, як і ў групе знакаў К, П, С:



Прааналізуйце свае памылкі і выканайце практыкаванне: літары к, п, с, д, л напішыце па два-тры радкі.

4. СПАЛУЧЫЛІСЯ

Мы з алфавіта рытмічнай стэнаграфіі, таму ў словах злучаемся лёгка і натуральна:



Да сустрэчы ў наступным нумары!

Урок вёў
Уладзімір ГЕРАСІМАЎ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
26 кастрычніка
Зак. 1634.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.